# ПАЛІТЫКА РАСІІ АДНОСНА КРАІН ЦЭНТРАЛЬНАЙ І УСХОДНЯЙ ЕЎРОПЫ: ПОГЛЯД З ВАРШАВЫ

**Мечыслаў Часноўскі**

У польскім грамадстве пастаянна стаіць пытанне аб доўгатэрміновай стратэгіі ў адносінах да вялікага ўсходняга суседа. Часам падкрэсліваецца, што расійскі вектар можа аказацца карысным, паколькі аслабленая Расія патрабуе польскай падтрымкі. Шматлікія апаненты гэтай плыні не адмаўляюць узаемна добрасуседскіх адносін, але перасцерагаюць супраць прарасійскасці. Апошняя непазбежна створыць умовы для адраджэння неаімперскай палітыкі, свабоды манеўру Расіі ў Сярэдняй Еўропе і, як вынік, патрэбу ўзнаўлення барацьбы палякаў за суверэнітэт ва ўмовах саперніцтва звышдзяржаў. Польская знешнепалітычная дактрына вызначае, што ў любым выпадку з боку Расіі зыходзіць небяспека [1] . Зразумела, што палітыка Расіі адносна краін сярэднееўрапейскага рэгіёну вывучаецца надзвычай уважліва. Аднак, варта зазначыць, аналітыкі засяроджваюцца пераважна на яе паўсядзённых знешнепалітычных кроках, ствараючы сцэнарыі “на патрэбу дня”. Абагульняючых прац не хапае.

## Галоўныя мэты

Сярод польскіх спецыялістаў-міжнароднікаў існуе згода, што з 1993 г. галоўныя напрамкі расійскай знешняй палітыкі стабілізаваліся і застаюцца нязменнымі. Яны скаардынаваны ў дакументах міністэрстваў замежных спраў і нацыянальнай абароны, службаў бяспекі і пацверджаны ў шматлікіх выказваннях расійскіх палітыкаў. Іх падтрымлівае апазіцыя, як парламенцкая, так і пазапарламенцкая. На першае месца Масква вывела мэту рэінтэграцыі абшару былога СССР з улікам спецыфікі балтыйскіх дзяржаў, патэнцыялу і намераў Украіны, нацыянальна-культурнай адметнасці краін Сярэдняй Азіі.

Пасля этапу дынамічных прававых дзеянняў, якія нарадзіў больш за 1000 дакументаў, што рэгулююць на паперы функцыянаванне СНД, расійскія палітыкі зрабілі стаўку на прагматызм. Гэта азначае вылучэнне на першы план рэальнага кантролю над усім абшарам і больш лагодны націск у палітычнай сферы. Гаворка вядзецца пераважна аб тым, каб Расія магла быць цалкам упэўнена, што праблемы бяспекі гэтага абшару будуць вырашацца разам з ёю і з апорай на яе ваенны патэнцыял; каб Расія захавала максімальны кантроль над камунікацыямі і энергетычнымі лініямі перадач; каб яна мела свабодны доступ да стратэгічнай сыравіны і каб ключавыя галіны набраўшых моц дзяржаў Садружнасці былі звязаны з расійскай гаспадаркай. Аптымальны вынік такога працэсу прывядзе да сітуацыі, пры якой па пытаннях бяспекі і эканамічнага супрацоўніцтва якой-небудзь дзяржавы ці рэгіёну СНД кожнаму партнёру найвыгадней будзе размаўляць з Масквой. У той жа час напружанасць і канфлікты па-за межамі Расійскай Федэрацыі не ўключаюцца ў сферу яе непасрэднай кампетэнцыі і адказнасці.

Асобныя польскія аналітыкі сцвярджаюць, што дзеля захавання глабальнага ўплыву Расіі на руку драматычная сітуацыя ў краінах еўрапейскай часткі былога СССР [2] , дзе паўсюдна з 1994 г. паглыбіўся эканамічны спад. Вызваленая ад дзяржаўнага рэгулявання эканоміка не знаходзіць здольнасці для самастойнай дзейнасці. Не падлягае сумненню, што краіны, якія ад веку ўваходзілі ў ядро імперыі (Украіна, Беларусь), перажывуць найбольшыя цяжкасці ў стварэнні нацыянальнай эканомікі. Абвастрэнню цяжкасцей спрыяе недахоп адвагі і рашучасці, каб разгарнуць рэформы, увёўшы стабілізацыйныя праграмы, цвёрдую і ўпарадкаваную грашовую палітыку, як гэта зрабілі Польшча і краіны Вішаградскай групы.

Сітуацыя пагаршаецца, нават ствараецца ўражанне яе безнадзейнасці. Грамадства гэтых краін усвядоміла, што ўжо змарнавана некалькі год. Увядзенне дынамічнай стабілізацыйнай палітыкі пагражае расцягнуць гэты перыяд яшчэ на пэўны час. З-за працяглага эканамічнага спаду з’явіліся сімптомы генеральнага павароту да адзяржаўленай і рэгуляванай эканомікі, вяртання да адзінага палітычнага і гаспадарчага арганізма. У многіх краінах былога блоку цяжкасці рэфармавання выклікаюць імкненне адмовіцца ад рынку. Расійская палітыка дазіраванай дапамогі (манеўравання “энергетычным кранам”) спрыяе такім настроям. Прыклад беларускага рэферэндуму ў 1995 г. паказвае, што ў рэгіёнах, сцісла звязаных з імперскім мінулым Расіі, усё гэта можа падвесці да ўцёкаў ад незалежнасці [3] .

Дасягненне мэты рэінтэграцыі абшару былога СССР пад эгідай Расіі, па меркаванні Варшавы, разглядаецца як першая ўмова правядзення расійскай знешняй палітыкі на іншых кірунках.

Сярод гэтых іншых кірунках на першы план выводзіцца вяртанне пазіцый сусветнай дзяржавы. Гэта азначае палітычнае ўраўнаважанне са Злучанымі Штатамі Амерыкі па пытаннях, што датычаць акрэслення сусветнага парадку. Задача гэта няпростая з улікам унутранай няўстойлівасці і непераадоленых дагэтуль вынікаў распаду камуністычнай імперыі, але для большасці сённяшніх расійскіх палітыкаў яна ўяўляецца вартай калі не вырашэння, то хоць бы спробы.

Безумоўна, гэтая амбіцыйная задача знаходзіць свой выраз і ў еўрапейскай палітыцы Расіі. У прапаноўваемых Масквой з 1993 г. новых адносінах у Еўропе застаюцца нязменнымі два элементы:

— для ЗША адводзіцца роля адной з важных дзяржаў, а не сусветнага лідэра, гарантуючага стабільнасць і бяспеку кантынента;

— Расія займае пазіцыю, роўную ЗША (часам СНД параўноўваецца з НАТА і ЕС), і мае права ўплыву на важнейшыя еўрапейскія рашэнні.

Часноўскі Мечыслаў Эдвардавіч — кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры міжнародных адносін, намеснік дэкана факультэта міжнародных адносін Беларускага дзяржаўнага універсітэта

Адначасова інтэнсіўна развіваюцца двухузроўневыя адносіны з вядучымі еўрапейскімі дзяржавамі — Германіяй, Францыяй і Вялікабрытаніяй, з аднаго боку, і еўрапейскімі інтэграцыйнымі структурамі, з другога, з націскам на расійскі нацыянальны інтарэс як вызначальнік напрамку і спосабу вядзення палітычнага курса. У гэтым кантэксце выразна праглядаецца імкненне Расіі да рэалізацыі еўрапейскай палітыкі з пазіцыі "raison d'etat" (дзяржаўнага інтарэсу). Яе поспех азначаў бы аслабленне заходніх інтэграцыйных тэндэнцый і вяртанне да палітыкі раўнавагі сіл ці нават стварэння шансаў для новай гульні звышдзяржаў, што гарантавала б Расіі вырашальную ролю на кантыненце.

Паводле ацэнак польскіх вайсковых аналітыкаў, у Расіі захавалі пэўны ўплыў палітычныя сілы, якія бачаць у НАТА патэнцыяльнага ваеннага праціўніка. Тым не менш пасля распаду СССР Масква распачала работу над новай абарончай дактрынай. У ёй зроблены спробы дастасавацца да заходнееўрапейскіх нормаў; няма спасылак на палажэнне з часоў Гарбачова аб "свеце без ядзернай зброі". Расійская Федэрацыя пацвердзіла былое абавязацельства не ўжываць першай ядзерную зброю і адначасова пераняла еўрапейскую філасофію запалохваючых якасцей гэтай зброі.

Распрацоўка новай расійскай дактрыны была прыспешана пасля кастрычніцкіх падзей 1993 г. у Маскве. Ва ўведзеных папраўках знайшліся сюжэты як аб магчымых знешніх праціўніках, так і аб унутранай пагрозе. Адгэтуль запіс аб эвентуальным ужыванні арміі ў спрэчках на ўласнай тэрыторыі. Прынцыпам абароннай палітыкі ў дактрыне папярэднічаюць сфармуляваныя каноны знешняй палітыкі. Важнейшы з іх: Расія і далей застаецца сусветнай дзяржавай, ніколі не адмовіцца ад інтарэсаў глабальнага характару і будзе захоўваць ранейшы ўплыў на фарміраванне палітычнай сітуацыі ў свеце. Расія выказваецца за стратэгічнае партнёрства з НАТА, але не жадае дапусціць залішняга скарачэння ўласных узброеных сіл. Яна трактуе ўвесь постсавецкі абшар як сваю сферу бяспекі і лічыць любую дзейнасць па недапушчэнні ўнутранай інтэграцыі дадзенай сферы за парушэнне яе ўласных інтарэсаў. Расія не вызначае ніякую дзяржаву як свайго ворага, але падрыхтоўваецца да абароны ва ўсіх напрамках [4].

З моманту ўступлення Я. Прымакова на пасаду міністра замежных спраў большы націск стаў рабіцца на падтрымку шматполюснай канструкцыі сусветнага парадку. Масква імкнецца, хоць і без вялікага поспеху, вярнуць пазіцыю аднаго з пасрэднікаў у рэгіянальных канфліктах (у былой Югаславіі, на Блізкім Усходзе, на Карэйскім паўвостраве, у пакістана-індыйскім дыялогу).

## Месца Сярэдняй Еўропы

У лістападзе 1993 г. на Савеце па знешняй палітыцы міністр А. Козыраў заявіў, што прыярытэтам Расіі з'яўляюцца добрасуседскія адносіны з краінамі Усходняй Еўропы, а перамены, што там адбыліся, патрабуюць ад РФ новага акрэслення сваіх нацыянальных інтарэсаў у гэтым рэгіёне. Масква вырашыла распрацаваць новыя, больш адкрытыя прынцыпы знешняй палітыкі адносна саюзнікаў па былым Варшаўскім дагаворы [5].

У Варшаве такі намер быў успрыняты як натуральны, паколькі ад часу распаду СССР Сярэдняя Еўропа ўвогуле не ўзгадвалася ў галоўных напрамках расійскай знешняй палітыкі, а канцэпцыя пашырэння НАТА і ЕС на Усход ужо стала галаўным болем расійскіх палітыкаў. Аднак, нягледзячы на шматлікія абяцанні, згаданая праграма не была прадстаўлена, за што, між іншым, расійскае МЗС неаднаразова пападала пад крытыку апазіцыі і незалежных экспертаў. Я. Прымакоў пакуль што ўсяго толькі абмежаваўся абвяшчэннем распрацоўкі праграмных прынцыпаў палітыкі адносна Цэнтральнай і Усходняй Еўропы (ЦУЕ).

Ці азначае гэта, што Расія не мае адносна рэгіёну ніякай палітыкі, што рухаецца па гэтым абшары без дарожных указальнікаў? Пазітыўны адказ на гэтае пытанне Варшава палічыла б памылкай. Адсутнасць такой палітыкі толькі ўяўная. Мэты расійскай стратэгіі даволі ясныя, стабілізаваўся набор інструментаў для іх дасягнення. Расія пагадзілася з распадам савецкай імперыі. Але гэта зусім не азначае згоды на далучэнне былых саюзніцкіх дзяржаў да структур, якія для расійскай дзяржавы застаюцца вонкавым светам. Найвыразней такая пазіцыя была прадстаўлена ў лісце, накіраваным у канцы лета 1993 г. кіраўнікам буйнейшых краін Захаду (ЗША, ФРГ, Францыі і Вялікабрытаніі) прэзідэнтам Б. Ельцынам. Ён пажадаў, каб адносіны заходніх дзяржаў і інстытутаў з Расіяй былі "на некалькі градусаў цяплейшымі", чым з дзяржавамі былога Варшаўскага дагавору. У Польшчы не сумняваюцца, што гэтае пажаданне актуальнае і сёння.

У гэтым кантэксце цікавы змест укладаецца ў расійскую формулу: "ЦУЕ павінна стаць расійскім мостам, а не бар'ерам на Захад". Лічыцца, што Расія па-за абшарам СНД імкнецца стварыць пояс прыязных дзяржаў, павязаных з ёю эканамічна і гатовых адносна важнейшых еўрапейскіх праблем заўсёды ўлічваць яе інтарэс. З гэтага пункту погляду ўключэнне групы сярэднееўрапейскіх краін у НАТА ці ЕС, безумоўна, не знойдзе згоды.

Варшава не хавае ўласнага непакою, што афіцыйныя прынцыпы расійскай абарончай палітыкі — толькі заслона, а на справе дактрына ацэньвае Польшчу як непрыязную дзяржаву. У пацвярджэнне прыводзяцца выказванні асобных расійскіх палітыкаў і генералаў. "Усялякімі палітычнымі метадамі не дапусціць таго, каб Польшча аказалася прынятай у НАТА" — нібыта такая фармулёўка, па дадзеных польскай прэсы, змешчана ў праекце згаданага дакумента. Яго аўтарам названы былі міністр абароны П. Грачоў. На адпаведны запыт польскага боку расійскія міністэрствы замежных спраў і абароны адмовіліся пацвердзіць ці абвергнуць наяўнасць антыпольскага запісу [6]. Апроч гэтага, трывогу выклікае і адсутнасць адкрытых планаў дыслакацыі шматлікіх вайсковых злучэнняў, якія ў апошнія гады выведзены з Германіі, Польшчы, Чэхіі і ў значнай частцы "аселі" непадалёку заходняй мяжы, асабліва ў Калінінградскай вобласці.

Дзеля заспакаення грамадскай думкі польскія палітыкі падкрэсліваюць, што ў Расіі цывілізаваныя прынцыпы палітыкі толькі зараджаюцца. Няма яснай канцэпцыі знешняй, абарончай і інш. стратэгіі. Сярод расійскага кіраўніцтва ўсё зводзіцца да барацьбы за "доступ да вуха Ельцына". Нават адно-

на згоды Масквы на флірт краін Сярэдняй Еўропы з НАТА няма адзінства. У гэтым кантэксце маскоўскім прымірэнцам з Польшчай доўгі час называўся былы кіраўнік адміністрацыі прэзідэнта С. Філатаў [7].

На пачатку 1994 г. міністр А. Козыраў заявіў, што дзяржавы ЦУЕ, якія праз два стагоддзі заставаліся ў моцнай звязцы з Расіяй, і надалей знаходзяцца ў сферы яе інтарэсаў; ён заклікаў не асцерагацца ў выказванні такой пазіцыі [8] .

У Варшаве выводзяць з усяго згаданага асноватворную задачу расійскай палітыкі: процістаяць такім зменам у міжнародных зносінах сяряэднееўрапейскага рэгіёну з заходнімі структурамі, якія мелі б трывалы характар і абыходзілі Расію [9] . Менавіта адсюль выцякае мноства расійскіх ініцыятыў адносна еўрапейскай архітэктуры бяспекі. Сярод іх: перакрыжаваныя гарантыі Расіі (СНД) і Захаду для краін Сярэдняй Еўропы; адмова ад пашырэння НАТА на Усход, якое вядзе да знікнення паласы фактычна нейтральных дзяржаў пры заходняй мяжы Расіі; кадыфікацыя агульнай сістэмы еўрапейскай бяспекі на падставе Хельсінкскага Заключнага акта і Парыжскай Хартыі для новай Еўропы; паэтапнае пашырэнне Заходнееўрапейскага саюза аж да ператварэння яго ў "заходне-усходні еўрапейскі саюз ад Атлантыкі да Урала"; наданне Савету Еўропы вырашальных функцый у галіне бяспекі і інш. 5 лютага 1998 г. міністр замежных спраў ФРГ К. Кінкель выявіў, што Я. Прымакоў прапанаваў гарантаваць бяспеку Сярэдняй Еўропе не праз уключэнне яе ў НАТА, а праз сістэму двухбаковых гарантыйных дагавораў. Пазней дадзеная прапанова была ўдакладнена гатоўнасцю перагледзець пазіцыю з умовай, што ў Сярэдняй Еўропе паўстане без'ядзерная прастора, якая ахопіць таксама Украіну і Беларусь.

Такое багацце канцэпцый, на думку польскіх палітыкаў, павінна дэманстраваць добрую волю расійскага боку, а па сутнасці адцягваць любое рашэнне Захаду, весці гульню на час.

Не ўсюды ў рэгіёне намаганні Расіі даюць плён. Таму дзеля аслаблення празаходняй і праінтэграцыйнай палітыкі дзяржаў Сярэдняй Еўропы Масква прадпрымае дыферэнцыйную падтрымку знешнепалітычных канцэпцый краін рэгіёну. Яна заключаецца ў прапанове аргументаў дзеля пошуку "ўласнага шляху" і карыснасці аднаўлення былых сувязей.

Што датычыць апошняга, то ўпор робіцца на знешнеэканамічныя рычагі. Пасля эпахальнага рашэння СССР — увесці з 1.01.1990 г. валюту ў якасці адзінага плацёжнага сродку ў разліках з партнёрамі па СЭУ — Расія сарыентавалася, што замест напльіву валюты страціла кліентаў на свае тавары. У канцы 1992 г., калі ўсе дзяржавы ЦУЕ ясна акрэслілі свае празаходнія імкненні, Масква адступіла, прапанаваўшы пакрыццё ўзаемных даўгоў у нацыянальных валютах. Адпаведныя пагадненні былі заключаны з Балгарыяй (1992 г.) і Славакіяй (1993 г.). Нягледзячы на існуючыя ва ўсіх дзяржавах рэгіёну праблемы з валютай, дадзеная сістэма ўсё ж не спрацавала і большасцю была адхілена.

Між іншым, па сцвярджэнні польскіх аналітыкаў, яна задумвалася як інструмент дапаўняльны, які б садзейнічаў больш аб'ёмнаму супрацоўніцтву. Так, у лютым 1993 г. міністр знешнеэканамічных сувязей С. Глаз'еў прапанаваў надаць краінам ЦУЕ і Манголіі статус назіральнікаў пры СНД, без узгаднення з Варшавай заявіў, што расійскі ўрад разважае над увядзеннем прынцыпаў свабоднага гандлю з Польшчай. Пазней расійскім кіраўніцтвам былі агучаныя прапановы аб стварэнні ўсходнееўрапейскага аграрнага рынку і зносе бар'ераў для свабоднага цячэння сельскагаспадарчых прадуктаў; аб стварэнні свабоднай эканамічнай зоны на тэрыторыі былых сацыялістычных краін; аб аб'яднанні Цэнтральнаеўрапейскай асацыяцыі свабоднага гандлю (ЦЕАСГ) з абшарам вольнага гандлю СНД. У асобных выпадках прапановы пападалі на падрыхтаваную глебу; напрыклад, у снежні 1995 г. быў падпісаны мемарандум аб стварэнні зоны свабоднага гандлю паміж Расіяй і Славакіяй. Ідэя падалася заманлівай і для балгарскага прэм'ера Ж. Відэнава: па яго ініцыятыве прадстаўнікі краіны ўвайшлі ва ўтвораную ў сакавіку 1993 г. групу буйных фірм, банкаў і біржаў Расіі, Украіны, Беларусі і Югаславіі, аб'яднаную ў Славянскі эканамічны саюз, мэтай якога з'яўляецца духоўнае адраджэнне славянскіх народаў.

Адносна Польшчы расійская ідэя выкарыстання эканамічных рычагоў дзеля аднаўлення глабальнага ўплыву не праходзіць. Наадварот, яна аддалілася пасля падпісання ў лютым 1998 г. прадстаўнікамі шасці балтыйскіх дзяржаў (Швецыі, Даніі, Расіі, Літвы, Латвіі і Польшчы) пагаднення аб стварэнні самага буйнога ў Еўропе еўрарэгіёна "Балтыка" [10] .

Апроч паслядоўнай палітыка "размякчэння" структур рэгіёну, арыентаваных на заходнія нормы, Расія імкнецца прыцягнуць сярэднееўрапейскія дзяржавы да супрацоўніцтва ў выбраных галінах эканомікі. Да іх належаць аграрны сектар, носьбіты энергіі і ВПК. У сельскагаспадарчай сферы Расія абяцае аферты велізарнага рынку, які не запёрты якаснымі абмежаваннямі і дзе магчымыя бартэрныя і клірынгавыя кантракты. Носьбіты энергіі выкарыстоўваюцца як рычаг умацавання залежнасці ад паставак газу, нафты, а таксама тэхналогіі і матэрыялаў для атамных электрастанцый. Атрымаўшы ў спадчыну пакет савецкіх даўгоў у большасці краін ЦУЕ, Расія прапануе, прынамсі, хоць бы частковы зварот пастаўкамі ўзбраення (самалёты Міг-29, баявыя верталёты, танкі Т-72, бронетранспарцёры), перадачай адпаведных тэхналогій.

У адносінах да асобных краін выкарыстоўваецца культурна-ідэалагічны фактар (панславізм, праваслаўнае адзінства, антызаходні нацыяналізм), які падмацоўваецца нядаўнімі партыйна-персанальнымі ўзаемасувязямі.

Афіцыйная Варшава ўспрымае як факт, што Расія не пазбавілася намераў ад узнаўлення сферы нядаўніх уплываў аж да рэстаўрацыі былой імперыі. Але, з улікам рэалій, могуць скласці выключэнне з былых савецкіх рэспублік хіба што Літва, Латвія і Эстонія. А з былых дзяржаў-сатэлітаў Расія магла б пагадзіцца са стратай уплываў у Польшчы, Чэхіі і Венгрыі. Пры ўмове, што да дрэйфавання гэтых дзяржаў на Захад не далучацца іншыя, асабліва Украіна і Беларусь. Расія, напэўна, значна вастрэй запратэстуе, калі дзесьці ўзнікне спакуса ўмантаваць у адзіную структуру Польшчу, Украіну і Беларусь.

Такім чынам, адпаведна высноваў польскага боку, большасць праграмных прынцыпаў і дзеянняў Крамля ў Сярэдняй Еўропе закліканыя ствараць і мацаваць групы націску, якія павінны супрацьстаяць празаходняй арыентацыі рэгіёну ЦУЕ, а ў бягучай палітыцы даваць Расіі эканамічныя перавагі.

## Адносіны да пашырэння НАТА на Усход

У мінулыя дзесяцігоддзі Польшча незалежна ад сітуацыі, нават маючы фармальны суверэнітэт, заўсёды сутыкалася з абмежаванай магчымасцю вырашэння ўласнага лёсу. Пагэтаму сёння там не шукаюць альтэрнатывы выбранай пасля 1989 г. празаходняй палітыцы. Дапускаюць яе эластычнасць, лічачы магчымымі кампрамісы і нават уступкі, але не адыход ад прынцыпаў. Якая-небудзь іншая палітыка, напрыклад усходняя — больш адкрытая на Расію, прымальная толькі пры ўмове моцнай апоры, у тым ліку арганізацыйнай, на еўрапейскія структуры, перад усім на Еўрапейскі саюз і Атлантычны пакт.

Згаданае імкненне блізкае да ажыццяўлення. Як вядома, Польшча, Чэхія і Венгрыя ў снежні 1997 г. на саміце ў Бруселі атрымалі афіцыйнае запрашэнне ў НАТА. Канчатковае рашэнне будзе прынята на сустрэчы ў вярхах дзяржаў альянса ў Вашынгтоне ў 1999 г. Гэта падзея не паўплывала на пазіцыю расійскага кіраўніцтва: яно па-ранейшым пярэчыць пашырэнню НАТА на Усход. Можна меркаваць, што палавінчатае рашэнне, прынятае ў Бруселі, якраз прадыктаванае імкненнем далікатна змяніць гэту пазіцыю на працягу двух год.

У Варшаве спадзяюцца, што вычакальная палітыка павінна даць плён у вырашэнні наступнай, вельмі істотнай для палякаў, праблемы ўваходу балтыйскіх краін у НАТА насуперак волі Расіі [11]. Па аналогіі нагадваюць, што тры гады таму ў Вашынгтоне гаварылі, што Расія ніколі не пагодзіцца на ўваход Польшчы ў НАТА. Цяпер тое самае гавораць ужо аб балтыйскіх дзяржавах. Па сцвярджэнні З.Бжэзінскага, калі праз пяць год паўстане ў парадак дня праблема пашырэння НАТА за кошт балтыйскіх краін, то за 15 год з'явіцца пытанне аб прыёме ў Пакт Украіны. І Расія будзе вымушана да гэтага прыстасавацца. Бо такая рэчаіснасць, а Масква ў рэшце рэшт пагаджаецца з цвёрдай рэчаіснасцю [12]. Сёння Расія, падкрэсліваюць атлантысты, дзяржава вялікая, але адсталая і замучаная шматлікімі цяжкасцямі. Думаючы аб яе будучыні, трэба прадбачваць, што на паўднёвым усходзе расце і хутка развіваецца рэгіянальная звышдзяржава, а ўвесь поўдзень — гэта дзяржавы ісламскія з магутным тылам. Апошнія з'яўляюцца для Расіі значна большай пагрозай, чым яна для іх. Крэмль мусіць лічыцца з гэтым штораз больш, бо калі лёгкадумна трапіць у якія-небудзь авантуры, то вынікам будзе значна большая і горшая Чачня, хоць і з той малой Расія не дала рады. Пагэтаму Расія пагодзіцца з рыўком не толькі балтыйскіх дяржаў, але, у свой час, і Украіны на Захад.

І ўсё ж адзінства адносна пашырэння НАТА на Усход у польскім грамадстве не існуе.

Там даволі моцная плынь праціўнікаў уваходу ў Паўночнаатлантычны блок [13]. Сваю пазіцыю яе прыхільнікі падмацоўваюць шматлікімі аргументамі. Важнейшы сярод іх — апраўданая небяспека ад рэакцыі Расіі. Пашырэнне НАТА замыкае перад ёй дзверы ў Еўропу, спіхвае ў Азію. Для расійскіх рэфарматарскіх сіл гэта сігнал, што Захад недаацэньвае іх высілкі. Адначасова гэта вада на млын кансерватыўных, нацыяналістычных і аўтарытарных колаў, якія бачаць у Еўропе ворага. Калі нават Расія пагодзіцца з пашырэннем НАТА як з фактам рэчаіснасці, то не пагодзіцца з гэтым духоўна, а незадаволенасць расіян выкарыстаюць праціўнікі дэмакратыі і Еўропы. Расія пойдзе ліхім і агрэсіўным курсам. Трэба будаваць масты, падтрымліваць дэмакратычныя і рынкавыя сілы, а не антаганізаваць краіну пашырэннем заходняга ваеннага блоку.

Сёння Расія не пагражае Сярэдняй Еўропе, сцвярджаюць антынатаўцы. Яна слабая і занадта занятая праблемамі трансфармацыі, каб думаць аб падпарадкаванні дзяржаў, якія не належалі да СССР. Але Маскве патрэбна пачуццё бяспекі, каб трансфармацыю — нашмат цяжэйшую і бурную, чым у іншых посткамуністычных краінах — давесці да канца. Яна мусіць мець "шэрую паласу", аддзяляючаю ад НАТА, каб не адчуваць сябе ізаляванай. У праціўным выпадку верх возьмуць нацыяналісты, і тады настане сапраўдная бяда ў гэтай частцы Еўропы. НАТА не забяспечыць яе ўнутранай стабільнасці. Гэта саюз вайсковы, накіраваны супраць Расіі як ворага, што відавочна, і расіяне аб гэтым ведаюць. Такі саюз не патрэбны сёння сярэднееўрапейскім дзяржавам. Гістарычны вопыт вучыць, што Расія рэдка дзейнічае праз непасрэдную агрэсію, а падпарадкоўвае сабе краіны праз закулісныя дзеянні прарасійскіх сіл, праз агентуру і марыянеткі. І перад такімі дзеяннямі рэгіён не ўратуецца ніякім ваенным саюзам.

Расія цяжка ідзе да дэмакратыі, а пашырэнне НАТА ўвогуле схіліць яе да адбудовы агрэсіўнай імперыі, варожай да аб'яднанага Захаду. Пагэтаму лепшай дапамогай у пераўтварэнні Расіі ў дэмакратычную дзяржаву павінна стаць адхіленне варожасці, падтрымка дэмакратычных інстытутаў, развіццё бізнесу. Тут Польшча, як лідыруючая ў трансфармацыі краіна, можа вельмі шмат зрабіць, але павінна таксама пазбавіцца як неразумнага страху перад Расіяй, так і спецыфічна польскага пачуцця вышэйшасці адносна расіян. Ёсць апасенні, што, калі Польша акажацца ў НАТА, беспрычыннае і раздражняльнае для расіян польскае пачуццё вышэйшасці яшчэ больш узмоцніцца [14].

Разам з тым, трэба падкрэсліць, антынатаўская плынь лічыць рух Еўрапейскага саюза на Усход вельмі пажаданым працэсам, які пашырае сферу дэмакратыі, свабоднага рынку і дабрабыту, не нацэльваючы супраць нікога ваеннага вастрыя. Еўрасаюзу трэба пастаянна пашырацца на Усход, ахапіць не толькі сярэднееўрапейскія краіны, але і балтыйскія, потым Украіну, а па меры развіцця дэмакратыі і рынку — таксама і Расію (адметна, што Беларусь пры гэтым не ўзгадваецца. — *М.Ч.*) [15].

Як бачна, у Польшчы дастаткова дзеячоў, палітычных і грамадскіх, якія засяроджваюцца на праблеме: альбо-альбо. Альбо ўваход у НАТА, альбо развіццё добрасуседства з Расіяй. Але на афіцыйным узроўні пераважае пазіцыя, што вялікім шансам для Польшчы было б спалучэнне працэсу ўваходжання ў НАТА з фарміраваннем больш прыязных адносін з Расіяй, якія асноўваюцца на прынцыпе партнёрства і павагі да самастойнасці. З хвіліны ўваходу ў НАТА і ўсведамлення бяспекі польскія страхі перад Расіяй павінны знікнуць. Тут праглядваецца аналогія з працэсам паяднання Германіі і Францыі ці Германіі і Польшчы. Менавіта НАТА, а не васальная пазіцыя або затрыманне ў неакрэсленай

"шэрай паласе", нясе шанс развіццю польска-расійскіх палітычных і эканамічных стасункаў.

Такім чынам, у польскім грамадстве няма адзінай ацэнкі пазіцыі Расіі адносна пашырэння НАТА на Усход. Погляды сходзяцца ў наступным: еўрапейскі лад канца XX ст. яшчэ не збудаваны; надалей краінам ЦУЕ пагражае лёс суб'екта ў гульні звышдзяржаў; такі стан можа працягвацца настолькі доўга, наколькі рэгіён застанецца "шэрай паласой" палітычнай і эканамічнай слабасці, а звышдзяржавы будуць яму ахвяроўваць сумніўныя гарантыі.

## Асаблівасці расійска-польскіх адносін

У геапалітычным сэнсе на вызначэнне курсу развіцця Польшчы, як і заўсёды ў мінулым, вырашальны ўплыў аказваюць альбо Усход, альбо Захад. У гэтым кантэксце польская дзяржава імкнецца працягваць гістарычную лінію недапушчэння альянсу Германіі з Расіяй без удзелу Польшчы. Вырашэннем гэтай дылемы, адпаведна польскім намерам, была б важкая пазіцыя абодвух вялікіх суседзяў у сістэме еўрапейскага супрацоўніцтва з актыўным і ўплывовым удзелам Польшчы.

Але з 1994 г. адбываецца працэс расійска-германскага збліжэння. Вядома, без пасрэднікаў. Вось чаму размову ў Боне на пачатку студзеня 1994 г. кіраўнікоў германскага і расійскага знешнепалітычных ведамстваў К. Кінкеля і А. Козырава аб перспектыве восі Бон — Масква старшыня камісіі па знешняй палітыцы Сейму РП Б. Герэмек палічыў дастаткова небяспечнай з'явай для Польшчы і заклікаў суайчыннікаў уважліва назіраць за гэтым працэсам. Герэмек вызначыў, што дырэктывай польскай знешняй палітыкі павінна быць адсочванне пагроз, працідзеянне і адначасова захаванне рэалізму ў ацэнцы сапраўднай пагрозы [16] .

Непакой з нагоды рэстаўрацыі ў Польшчы імперскага ўплыву Расіі — пастаянны спадарожнік ацэнкі палякамі знешніх і ўнутраных крокаў сваёй вялікай усходняй суседкі. Такое пачуццё не пакідае іх пасля вядомых падзей восені 1993 г. Вось, напрыклад, адно з тыповых уражанняў сярэдняга паляка. Чацвер, 23 верасня. Расія мае двух прэзідэнтаў, двух міністраў абароны і па два міністры на іншыя ключавыя ведамствы — бяспекі і ўнутраных спраў. З аднаго боку Ельцын з дэкрэтам аб роспуску парламента, з другога — Руцкой, ануляваўшы дэкрэт Ельцына. Калі Ельцын прайграе ў палітычнай барацьбе, то... Польшча акажацца зноў сярод лідэраў перамен. Працяглы час пры апытаннях каля 70 % рэспандэнтаў выказваюць апасенне перад расійскай ваеннай пагрозай, 65 % — сцвярджаюць аб палітычнай пагрозе.

Кастрычніцкія (1993) падзеі ў Маскве польскія аналітыкі разглядалі ў кантэксце змены не толькі ўнутранай, але і знешняй палітыкі. Штурм маскоўскага Белага дома быў названы вяртаннем дыктатуры, але не ранейшага крывавага дыктату ўзурпатара. Калі б інакш, то Руцкога і Хасбулатава застрэлілі папросту падчас арышту. Аднак калі пад паняццем дыктатуры разумець засяроджанне ўлады ў адных руках і абмежаванне грамадзянскіх свабод, то менавіта такі стан у Маскве аднатавала афіцыйная Варшава. Па падліках уплывовага часопіса "Wprost", 500 забітых і сама меней 700 раненых — такім быў вынік баёў [17]. Штурм паставіў Б. Ельцына ў залежнасць ад ваеннага комплексу і вымусіў траціць мільёны долараў, каб утрымаць гэты комплекс у стане задавальнення генералаў. Пазіцыя генералітэту адразу адбілася і на палітыцы да суседзяў РФ, падставай чаго з'явіўся згаданы вышэй ліст Ельцына да ўрадаў дзяржаў—членаў НАТА.

Гэты ліст, па меркаванні тагачаснага міністра абароны РП Я. Анышкевіча, падоўжыў, хоць і не перакрэсліў, шлях Польшчы, Чэхіі і Венгрыі ў структуры НАТА. Крэмль яскрава акрэсліў думку, што паспешнае прыняцце сярэднееўрапейскіх краін у Паўночнаатлантычны саюз не выкліча расійскага энтузіязму. Асобныя расійскія палітыкі запатрабавалі, каб гэта ўсвядомілі і афіцыйныя колы Заходняй Еўропы, раптам зажадаўшыя дапоўніць "сям'ю" новымі членамі. "Удакладненне" афіцыйнай пазіцыі прэзідэнта Б.Ельцына было пачатае артыкулам у газеце "Сегодня", дзе прадстаўнік МЗС В. Елагін сфармуляваў пытанне: "Чаго не зразумелі ў Варшаве?" Там, у прыватнасці, падкрэслівалася: "Складаецца ўражанне, што ў некаторых замежных колах заява расійскага прэзідэнта ацэнена як найважнейшы вынік афіцыйнага візіту ў Варшаву. Тым часам не заўважана, што ў падпісанай супольнай дэкларацыі рашэнне Польшчы аб намеры далучыцца да НАТА звязваецца з працэсам агульнаеўрапейскай інтэграцыі. Было б добра, калі ў Варшаве яшчэ раз уважліва прачытаюць дэкларацыю" [18] . Змена настрою ў Крамлі і спробы інтэрпрэтацыі "несвядомага абяцання Ельцына ў Варшаве" адразу былі аднатаваны на Захадзе. Асаблівы непакой там выклікала пазіцыя расійскага Генеральнага штаба, які перасцярог супраць пашырэння НАТА, "выкарыстаўшы часовае аслабленне Расіі".

Дыктатура Ельцына была акрэслена як шкодная і для Польшчы. Але віна за тое, што Ельцын стаў адмаўляцца ад абяцання не супраціўляцца ўступленню Польшчы ў НАТА, ускладалася і на польскіх палітыкаў, якія незвычайна раструбілі па свеце аб сваім поспеху, не замацаваўшы яго ў Маскве ніякімі дыпламатычнымі дзеяннямі. Як бы ўсклалі спадзяванне на тое, што ўсё беспаваротна вырашыў прэзідэнт Л. Валенса.

Паводле ацэнкі вядомага польскага палітолага В. Кучыньскага, падзеі ў Маскве мелі агульнарасійскія карані. Гэта быў не звычайны путч, а мяшанка з элементамі народнага паўстання супраць уладаў, абвінавачаных у саўдзеле ў разбурэнні імперскай дзяржавы. Другая прычына: Расія аказалася прыкладам краіны з расцягнутым шляхам да рынкавай эканомікі і запозненай гаспадарчай трансфармацыяй з-за небяспекі сацыяльных катастроф. Там, па сцвярджэнні палітолага, вырашана за лепшае лагодзіць тэрапію, каб пазбегнуць шоку — спаду прадукцыі, інфляцыі, банкруцтва прадпрыемстваў, беспрацоўя і да т. п. Лічыцца, што ўсе гэтыя праблемы становяцца вынікам занадта хуткага адыходу ад сацыялістычнай планавай эканомікі, як гэта аказалася ў Польшчы [19] . У рэшце Расія дайшла да "шоку без тэрапіі". Грамадства спазнала ўсе нягоды, але размінулася з перавагамі, якія прыносіць радыкальнае лячэнне: паляпшэннем стану рынку і спадам інфляцыі.

Па меркаванні міністра замежных спраў Б. Герэмека, трэба лічыць небяспечнымі чутныя на Захадзе галасы, што важнейшай мэтай у Расіі з'яўляецца парадак, а не працэсы дэмакратычных перамен.

Мы становімся сведкамі гістарычнага парадоксу. У свой час расійская імператрыца Кацярына II у прыняцці Канстытуцыі Рэчы Паспалітай угледзела "французскую заразу". Зараз у асяроддзі польскіх уладных структур паглыбляецца пачуццё непакою ад так званага "ўсходняга віруса". Яго ўздзеяннем гатовы патлумачыць самыя разнастайныя ўнутраныя праявы грамадскага незадавальнення, непавагі да закона, не кажучы ўжо пра хістанні ў эканоміцы. І хоць аптымісты заспакойваюць, што для сённяшняй Польшчы чых з Захаду больш грозны, чым грып з Расіі, тым не менш "усходні вірус" грамадская думка атаясамлівае з "чумой XX веку", якая "пазбаўляе эканамічны арганізм ад ахоўных функцый і аднчасова бліскавічна падточвае дяржаўную і уладную тканку". Найлепшым прыкладам уладарання "чумы" называецца Расія. Яе разнавіднасць акрэслена як "алігархічна-крымінальная ўлада" або "карупцыя на службе дэмакратыі" [20] .

У адрозненне ад небяспекі рэстаўрацыі расійскага палітычнага ўплыву, Варшаву фактычна перастала турбаваць праблема эканамічнай залежнасці ад вялікай усходняй суседкі. Як вядома, буйнейшым гандлёвым партнёрам Польшчы быў Савецкі Саюз. Але з пачатку 90-х гг. палякі змаглі экспартаваць у Германію, Галандыю, Італію больш, чым у Расію. Толькі дзякуючы продажы газу і нафты Расія захавала пазіцыі ў польскім імпарце. Па стане на сярэдзіну 1993 г. ужо 68 % польскага экспарту накіроўвалася ў краіны Заходняй Еўропы. Расія ўладкавалася толькі на трэцім месцы, набываючы крыху больш за 5 % польскіх тавараў і паслуг. Самы значны абвал у гандлі Польшчы з Усходам наступіў у 1991 г. Тады ўзаемныя абароты склалі 2,3 млрд дол.

Істотныя змены адбыліся ў структуры абмену з Расіяй. У імпарце пераважыла энергетычная сыравіна (70 %), у экспарце амаль зніклі інвестыцыі і павялічылася доля спажывецкіх і харчовых тавараў. У першай палове 90-х гг. Польшча штогод закупляла ў Расіі 2/3 неабходнага для гаспадаркі газу (6 млрд куб. м) і 40 % (5 млн т) нафты. Перасцярогі адносна "закручвання крана" і палітычных праяў залежнасці Польшчы ад расійскіх паставак сыравіны не вельмі непакояць Варшаву. Пераважае думка, што ніхто ў Крамлі не адмовіцца ад некалькіх мільярдаў долараў, гарантавана паступаючых за продаж газу і нафты. Дапускаецца, што палітычны хаос і неразбярыха ў Расіі могуць яшчэ больш паменшыць польскі экспарт у гэтую краіну.

Палякі інакш, чым расіяне, разумеюць лібералізацыю замежнага гандлю. Паводле іх назіранняў, на Усходзе яна зводзіцца да ўвядзення новых кантынгентаў, ліцэнзій і сертыфікатаў дзеля атрымання максімальных даходаў; да мінімуму зводзіцца імпарт. Замежны гандаль цалкам лімітуецца адміністрацыйнымі загадамі. У Польшчы галоўным крытэрыем гандлю з замежжам лічыцца забеспячэнне ўнутраных патрэб.

Польскі бок за кароткі час пераканаўся ў супярэчлівасці прынятага на пачатку 1998 г. рашэння аб абмежаванні паездак усходніх суседзяў у краіну. Аднак такое рашэнне наспявала працяглы час. Яшчэ ў студзені 1993 г. МЗС РП выказалася за ўвядзенне візаў разам з запрашэннямі для грамадзян былога СССР (без балтыйскіх краін) і нестабільных посткамуністычных краін. На пытанне: ці належыць увесці візы для грамадзян СНД і некаторых дзяржаў Сярэдняй Еўропы, станоўчы адказ далі 40 %, адмоўны — 27 % апытаных палякаў. Праціўнікі візавага парадку рабілі акцэнт на штучным ускладненні ўезду ў краіну і сцвярджалі, што турыстычны рух з "дапамогай" візаў нідзе ў свеце не апраўдаўся. Прыхільнікі візаў аргументавалі сваю пазіцыю тым, што, пакуль на Усходзе пануе страшны эканамічны крызіс, точацца грамадзянскія войны і ўладарыць усемагутная мафія, датуль дзеля абароны польскай дзяржавы патрэбна ўжываць усе даступныя сродкі.

Польскае грамадства пазбавілася небяспекі ідэалагічнага ўціску з боку Расіі, уласцівай для пачатку 90-х гг., у прыватнасці, верагоднасці экспарту камунізму з Усходу. Больш таго, пераважае меркаванне, што смута ў самой Расіі хоць працягнецца некалькі дзесяцігоддзяў, але паварот да камунізму і там ужо немагчымы. Тое, што сёння лічыцца камунізмам у Расіі, Украіне ці на Беларусі — гэта толькі настальгія па "старым добрым часе" імперыі. Няма ўжо ні ўмоў для яе адбудовы, ні грамадскай падтрымкі для такога шляху. Напрыклад, тыпова імперская і няўдала закончаная для Расіі вайна ў Чачні не мела грамадскай падтрымкі. Адбудова імперыі ўцягнула б Расію ў так драматычныя і грозныя для яе канфлікты з суседзямі, што аказалася б па-за яе палітычнай і эканамічнай цэласнасцю. Расія мае толькі адзін выбар: адкрытасць для Еўропы, згоду на бясспрэчныя факты, на страту сфер уплыву, суверэнізацыю дзяржаў-васалаў. Вынікам будзе пераўтварэнне яе ў нармальную нацыянальную дзяржаву.

Дарэчы, польская грамадскасць надзвычай востра рэагавала на ваенныя дзеянні ў Чачні. Шырокі размах набыў збор гуманітарнай дапамогі насельніцтву гэтай рэспублікі. У маі 1995 г. створанае ў Кракаве таварыства Чачэнскі інфармацыйны цэнтр рыхтавала ў эфір радыёпраграмы для жыхароў Каўказа. У Агульнапольскі савет па радыёвяшчанні і тэлебачанні была накіравана заява аб зацвярджэнні канцэсіі радыё "Вольны Каўказ". Стварэнне згаданага радыё разглядалася грамадскай думкай як адзін са спосабаў процідзеяння чалавеказабойству ў Чачні. Сваёй задачай радыёпраграма абвясціла інфармаванне дзеля садзеяння прыпыненню вайны. Перадачы рыхтаваліся на чачэнскай, расійскай, армянскай, грузінскай і польскай мовах. Фінансавую дапамогу радыёпраграме гарантавалі розныя публічныя фарміраванні і асобы Польшчы, у першую чаргу — "Салідарнасць" [21] . Супраць стварэння падобнага радыёвяшчання рэзка выступіла Дзярждума Расіі. Узнікла верагоднасць таго, што ўлады Кракава свядома ці не рыхтавалі скандал у адносінах паміж Варшавай і Масквой. У рэшце рэшт радыё "Вольны Каўказ" не разгарнула дзейнасці.

Падводзячы вынік, трэба зазначыць, што сярод грамадскасці і ў кіраўнічых колах Польшчы назіраецца пастаянная цікавасць да палітыкі Расіі. Усведамляецца адзінства расійскіх эліт у поглядах на палітыку краіны ў Сярэдняй Еўропе. Усе знешнепалітычныя крокі Масквы правяраюцца "на антыпольскасць". Ад важнейшых расійскіх

унутрыпалітычных падзей, эканамічных рашэнняў імкнуцца пачуць рэха, адбітае ў сярэднееўрапейскім рэгіёне. Лічаць важнейшай мэтай не дапусціць расійска-германскага збліжэння без удзелу Польшчы. Раўніва рэагуюць на антынатаўскую рыторыку расійскіх палітыкаў, хоць па меры прасоўвання ў заходнія структуры крыклівы лозунг аб безумоўным праве Польшчы схавацца пад ахоўным парасонам НАТА, не пытаючы нічыёй згоды, пакрысе замяняецца прагматычнай вычакальнай пазіцыяй. Перыядычныя спробы Масквы запаволіць геапалітычны паварот краін Сярэдняй Еўропы ў заходнім напрамку, ці нават аднавіць там свой уплыў падаграюць у Варшаве рашучасць абараняць уласную сувярэннасць, але адначасова адбудоўваць эканамічнае супрацоўніцтва і пазбягаць дзеянняў, што даводзяць да абвастрэння адносін у палітычнай плоскасці. З доляй жарту палякі гавораць: не хацелі б баяцца Расіі, але Расіі, якой могуць не баяцца, пакуль што няма.

[1] Гл.: Między polityką a strategią. Warszawa, 1994. S. 12.
[2] Известия. 1998. 4 апр.
[3] Wprost. 1995. 28 maj. S. 46.
[4] Wprost. 1993. 31 paźdz. S. 4.
[5] Независимая газета. 1993. 13 нояб.
[6] Wprost. 1993. 31 paźdz. S. 4.
[7] Там жа. С. 9.
[8] W stronę nowego partnerstwa — Polsko-Rosyjska konferencja, Kraków, 23—25 lutego 1994. Kraków, 1994. S. 28.
[9] Polska w środowisku międzynarodowym: Problemy współzależnosci. Warszawa, 1993. S. 213.
[10] Wprost. 1998. 1 marz. S. 9.
[11] У пач. 1994 г. Літва першай сярод дзяржаў былога СССР падала фармальную заяўку аб прыёме ў НАТА.
[12] Wprost. 1998. 1 marz. S.72.
[13] Згаданая плынь грунтуецца на ацэнках шырока вядомага ў Польшчы Рычарда Пайпса — уплывовай асобы Захаду, праціўніка пашырэння НАТА. Р.Пайпс, амерыканскі гісторык і палітолаг, нарадзіўся ў Польшчы ў 1923 г. у яўрэйскай сям'і. У кастрычніку 1939 г. сям'і Пайпсаў удалося праз незалежную яшчэ Літву выехаць на Захад і далей у ЗША. Зараз Р.Пайпс — пенсіянер-прафесар Гарвардскага універсітэта, адзін з найлепшых знаўцаў Расіі і былога СССР. Быў галоўным саветнікам Р.Рэйгана па савецкіх справах на першым этапе яго прэзідэнцтва. За сваю ролю ў фарміраванні тагачаснай палітыкі ЗША адносна камуністычнага блоку адзначаны прэзідэнтам Л.Валенсам Камандорскім крыжам ордэна Заслугі РП.
[14] Справа ў тым, што з часоў сярэднявечча палякі празвалі расіян маскалямі. І зараз у працяг гэтай традыцыі "маскалём" называюць... смярдзючыя аэразолі для знішчэння шкоднікаў і не самыя шляхетныя людскія недахопы. У шырокім ужытку выказванне Напалеона: "Паскрабіце расіяніна і знойдзеце татарына". Паляк ахвотна ўвасабляе д'ябла ў постаці немца, але ў польскім слоўніку антынямецкіх мянушак няма так абразлівага слова, як выдуманае для вызначэння расіян — кацапы. Польскія адносіны да немцаў гістарычна былі непрыхільныя, але ахопленыя комплексам нізшасці. Адносна расіян, наадварот, авалодвала пачуццё высшасці. Праз прызму немца паляк адчуваў аддаленасць ад Еўропы, польскую асобнасць; праз прызму расіян пачуваўся еўрапейцам і адгароджваўся ад Азіі.
[15] Wprost. 1998. 22 lut. S. 71.
[16] Wprost. 1994. 9 stycz. S. 2.
[17] Wprost. 1993. 17 paźdz. C. 49.
[18] Сегодня. 1993. 4 нояб.
[19] Wprost. 1993. 17 paźdz. S. 63.
[20] Wprost. 1998. 30 sierp. S.3.
[21] Wprost. 1995. 28 maj. S. 28.


## SUMMARY

"The Policy of Russia Towards Central and Eastern European Countries: Warsaw Point of View"

The article follows in detail both Moscow's attempts repulsed by Warsaw to reestablish its influence on the most significant European decisions through the Central European capitals, and the immediate reaction of the Polish politicians (which is mainly negative and defensive) to the Kremlin's reintegration-aimed actions. As the background the problems of interdependence of European security and the national development of Russia are discussed. All that regularly stimulates Polish elite's constant readiness for action against possible moves of Russian policy-makers.

In the Western direction Russia faces not only global, but regional international problems as well. They are: the shift of the geopolitical preferences from East to West in this strategically crucial region of Central and Eastern Europe, and weakening of the economic cooperation with the former partners in Warsaw Treaty Organization. Russia has concurred with the Soviet Empire breakdown. However, this does not mean the consent to incorporation of the former allies into the structures, which are still alien to Russia. In Warsaw's opinion, the reintegration of the former Soviet sphere of influence is thought by Moscow to be the principal condition of the success of its regional policy. The second condition is the renewal of the structures, that would at least resemble the ones dismissed in the beginning of the 90's (Warsaw Treaty and Council for Economic Assistance). Due to its own difficulties Moscow is reluctant to declare whole Central and Eastern Europe the sphere of its national interests. Some inconsistent moves in that direction just brought some uneasiness to the region's capitals and a bit disquieted the West about the situation in this part of Europe.

That is why at the moment Russia is content with the minimum. Outside the CIS borders she is trying to create a belt of friendly states, linked to her economically and ready to take into account her interests regarding the main European issues. Therefore the incorporation of the Central-European countries into NATO and/or EU will, no doubt, find no support from the Kremlin.

The nuclear geopolitical role of Poland among the post-socialist European countries grants this former USSR's ally Moscow's special attention. In their turn, after the sharp turn to the West, the Polish foreign policy-makers constantly follow the reaction of the great Eastern neighbor, producing numerous scenarios of the anticipated Russian expansion into Central Europe. Polish foreign policis doctrine states that in any case there is a threat from Russia. In Warsaw's perception the main goal of the Russian foreign policy is blocking any positive shifts in this region's relations with the Western structures, that would supposedly be permanent and would bypass Russia.